***Эвеліна Шчадрына***

## ТВОРЧАЕ РАЗВІЦЦЁ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ Ў ПРАЦЭССЕ ЭТНАКУЛЬТУРНАГА ВЫХАВАННЯ

***(на прыкладзе шчомысліцкага гурта «Явар»)***

У XXI стагоддзі, калі ў нашай краіне ідзе рэфармаванне ўсёй нацыянальнай адукацыйна-выхаваўчай сістэмы і надзвычай актыўна распачалася дзейнасць па патрыятычным выхаванні дзяцей і моладзі[1], вялікае, але (на мой погляд) не дастаткова ацэненае значэнне набывае выхаваўчы патэнцыял актуалізацыі *традыцыйнай народнай культуры*. У гэтым кантэксце надзвычай важнае месца займае пошук шляхоў яе перадачы маладому пакаленню ў мэтах выхавання самадастатковых, свядомых, творчых і гарманічна развітых асобаў. У канцы мінулага года «**Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны**» **выказала небяспеку страты традыцыйных каштоўнасцей нашым грамадствам і прапанавала прэзідэнту А. Лукашэнка аб'явіць 2011 год Годам роднай мовы. Бо: «…**не будзе мовы — не будзе незалежнасці, а значыць, і краіны. Беларускі этнас можа знікнуць, як зніклі прусы ці яцвягі», — пазначана ў звароце **сакратарыята ТБМ ад 29 кастрычніка 2010 года [1].**

Працэс інтэграцыі чалавека ў грамадства і засваення ім пэўных сацыяльных ролей— *сацыялізацыя,*—як вядома, адбываецца адначасова з другім немалаважным працэсам *інкультурацыі* (у якім чалавек засвойвае прыналежнае культуры светасузіранне і паводзіны), у выніку чаго фарміруецца яго кагнітыўнае, эмацыянальнае і паводзіннае падабенства з прадстаўнікамі ўласнай культуры [2, с.171]. Працэсы сацыялізацыі і інкультурацыі пачынаюцца з моманту нараджэння дзіцяці на свет і ладзяцца напрацягу ўсяго жыцця праз камунікацыю паміж людзьмі, і канечны іх вынік—чалавек, кампетэнтны ў мове, рытуалах[2], каштоўнасцях сваёй культуры.

Раней, ва ўмовах традыцыйнага ладу жыцця, этнакультура і мастацтва былі неабходнымі натуральным складальнікам выхавання дзяцей і моладзі ў сям'і. На жаль, на сучасным этапе развіцця нашага індустрыяльнага, «посттрадыцыйнага» [3; с. 55] грамадства прыходзіцца канстатаваць факт разбурэння ўзгаданай сістэмы звыклага «сямейна-грамадскага» выхавання беларускай моладзі. Таму сёння вялікая роля ў этнакультурным выхаванні, сацыялізацыі і інкультурацыі належыць педагогам-прафесіяналам, установам культуры і адукацыі (што, часам, і неблага), але, адначасова, і вуліцы, і даступным моладзі камунікацыйным сістэмам, збольшага – інтэрнэту (што, пры незбалансаванай «дазіроўцы» можа стацца праблемай).

Нашы бліжнія суседзі — Расія і краіны Балтыі апошнім часам мэтанакіравана ствараюць Цэнтры этнічнай культуры. Такія ўстановы выкарыстоўваюць канцэптуальна распрацаваныя праграмы і методыкі навучання, якія адаптаваны для мясцовых умоў і асаблівасцей таго, чаму вучаць [4, с. 71]. Найбольш плённы і перспектыўны падыход да этнакультурнага выхавання моладзі сёння – каардынацыя дзейнасці этнапедагогаў з сучасным станам *мясцовага* фальклорна-этнаграфічнага асяроддзя. У рэгіёнах Беларусі ўжо існуе станоўчы вопыт такой дзейнасці, аб чым сведчаць вынікі Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» у г.п. Акцябрскі, каардынатарам і арганізатарам якога з'яўляецца вядомы беларускі этнахарэограф Мікола Козенка.

Найбольш пашырынай формай выхавання дзяцей сродкамі народнага мастацтва зараз з'яўляюцца заняткі ў фальклорна-этнаграфічных гуртках (якія лепей распачынаць з малодшага школьнага ўзросту) на базе цэнтраў творчасці дзяцей і моладзі, а таксама некаторых школ. Фальклорнае мастацтва, як з'ява сінкрэтычная і камунікатыўная, як мага лепей раскрывае эмацыйную і пачуццёвую сферу сучасных дзяцей ва ўмовах неабходнасці шодзённага выкарыстання кампутарнай тэхнікі і інтэрнэта. Машыны і віртуальная прастора часта падмяняюць сучаснай моладзі зносіны паміж рэальнымі людзьмі і не спрыяюць навучанню будаваць адносіны з імі. Такім чынам, не развіваюцца вельмі важныя становішча асобы – *эмоцыі* як псіхічныя працэсы, заснаваныя на *пачуццёвым* адлюстраванні патрэбаў значнасці знешніх уздзеянняў, іх спрыяльнасці ці шкоды для жыццядзейнасці індывіда. Гуртавыя зняткі па фальклору – гэта прыклад калектыўнай творчасці, дзе ўзаемадзеянні і зносіны ўдзельнікаў гуртка аб'ядноўваюць іх у сумесны творчы працэс, што дае станоўчыя вынікі ў мастацкім развіцці кожнай асобы аб'яднання.

На падставе Рэспубліканскага эксперэментальнага праекта «Танцавальны фальклор і дзеці», аўтарам якога з'яўляецца М.А.Козенка, пачалі ўтварацца дзіцячыя фальклорныя калектывы ва ўстановах адукацыі і культуры, якія пераймаюць традыцыі сваёй мясцовасці непасрэдна ад носьбітаў культуры свайго раёну. Гэта такія выдатныя гурты, як «Берагіня» (Барысаўскі раён, кіраўнікі Мікола Козенка і Антаніна Абрамовіч), «Рудабельскія зорачкі» (Акцябрскі раён, кіраўнік Вольга Дульская), «Нежачкі» (Расонскі раён, кіраўнік Валянціна Ліцвінава), «Верабейкі» (Любанскі раён, кіраўнік Сяргей Выскварка), «Калыхнака» і «Куманёк» (Мінскі раён, кіраўнік Ларыса Рыжкова).

Падобныя аб'яднанні працягваюць утварацца і зараз. Паўтары гады таму пры Шчомысліцкай сярэдняй школе выкладчыца вакальна-харавых дысцыплін і фальклору Святлана Балцэвіч (неаднаразовы

[1] Цікава, што, напрыклад у Латвіі з 2008 года таксама займаюцца патрыятычным выхаваннем і не ўсе мясцовыя педагогі ўпэўнены, што перапынак ў гэтай справе пайшоў на карысць народу.

[2] Рытуалы – сімвалізаваныя дзеянні, выконваемыя ў пэўным часе і месцы – існуюць не толькі ў культавых практыках, але і ў свецкім жыцці любой культуры (шлюб у ЗАГСе, грамадская паніхіда і г.д.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

глядач імпрэз «Берагіні») стварыла гурток «Явар» з вучняў 1-га і 2-га класаў (мал. 1). Дзеці распачалі знаёмства з традыцыйнай культурай беларусаў з побытавых танцаў, дзіцячага фальклору і каляндарна-абрадавых песень. Паралельна сп. Святлана вучыла некаторых з іх іграць на дудцы. Трэба адзначыць, што сама краўніца нарадзілася на Заходнім Палессі – у адной з вёсак Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці, і, ведаючы традыцыі свайго краю, імкнецца ўкараніць іх сярод сваіх выхаванцаў. Такім чынам, дзеці, не маючыя яркіх мастацкіх здольнасцей, затанчылі, заспявалі і зайгралі на дудках, свісцёлках, засвойлі народныя гульні, адным словам, распачалі сваё творчае развіццё сродкамі традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў.


Малюнак 1 – **Гурт «Явар»**


Малюнак 2 – **На «Калядным фэсце» ў Шчомысліцы**

За даволі невялікі час гурткоўцы бралі ўдзел як у шматлікіх унутрышкольных мерапрыемствах і канцэртах, так і буйных гарадскіх, рэспубліканскіх і нават міжнародных імпрэзах, такіх як: «Калядны фэст-2010» у Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, арганізаваны Т.Пладуновай (узельнічалі дзіцячыя і маладзёжныя гурты ўстаноў адукацыі і культуры г.Мінска), «Гуканне вясны» ў Цэнтральным дзіцячым парку імя М.Горкага, зробленым сумеснымі намаганнямі адміністрацыі самога парка і Цэнтраў творчасці дзяцей і моладзі Першамайскага і Партызанскага раёнаў г. Мінска (удзельнічалі гурты Мінска і Мінскай вобласці); постфальклорным канцэрце «Традыцыя і пераемнікі» ў рамках IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор» на сцэне Рэспубліканскага Палаца культуры ветэранаў.

Прыклад творчых імпрэз апантаных калег не пакінуў Шчомыслiцу абыякавай. 14 студзеня 2011г. сп. Святлана, яе вучні і калектыў школы наладзілі буйное свята «Калядны фэст», у якім узялі ўдзел 11 фальклорных гуртоў са школ і пазашкольных устаноў г. Мінска і Мінскага раёна, і нават з вышэйшых навучальных устаноў Мінска. А менавіта, з Мінская раёна прыехалі гурты «Пацеха» (Крупіцкая АСШ, кіраўнік Валянціна Юшкевіч) , «Калыханка» (Міханавіцкая АСШ, кіраўнік Ларыса Рыжкова), «Явар» (Шчомысліцкая АСШ, кіраўнік Святлана Балцэвіч). Калектывы мінскіх школ: «Вясёлка» (АСШ №1, кіраўнік Наталля Таберка), «Рада» (ДМШ №17, кіраўнік Ірына Катвіцкая) і гурт АСШ №159, якім таксама кіруе Святлана Балцэвіч. Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі прадставіў гурт «Верас», кафедра этнаграфіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў «Этна-суполку» (кіраўнік абодвух гуртоў – артыст-выкаліст вышэйшай катэгорыі, актыўны ўдзельнік працэсаў этнакультурнага выхавання і практычнай фалькларыстыкі Таццяна Пладунова), а Беларускі дзяржаўны універсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі — ансамбль народнай песні «Гаманіна» (кіраўнік Наталля Сазановіч). Два вялікія дзіцячыя калектывы прыехалі з Палаца культуры і спорту чыгуначнікаў: фальклорны гурт «Валошкі» (кіраўнікі Ганна Свібовіч і Іосіф Васілеўскі); дзіцячы ўзорны ансамбль беларускай песні «Цернічка» (кіраўнікі Вольга Кароткая і Дзмітрый Сарока).

Свята распачалося з вітання калектываў калядкамі і шчадроўкамі, працягнулася агульным карагодам «Ай, калядачкі, бліны-ладачкі» і вялікай танцавальнай імпрэзай у вестыбюлі школы, дзе гурты маглі навучыць астатніх удзельнікаў і гледачоў розным традыцыйным і побывтавым танцам і гульням з свайго рэпертуару (мал. 2). А на заканчэнне ўсе ўдзельнікі былі запрошаны на святочнае частаванне шчодрай куццёй, дзе можна было не толькі падсілкавацца, але і абмяняцца творчым вопытам, ўражаннямі і проста станоўчымі эмоцыямі.

Такім чынам, добрая традыцыя фестывальнай сустрэчы дзіцячых і маладзёвых гуртоў Міншчыны на Каляды, якая бярэ пачатак яшчэ з 2005 года (калі быў наладжаны першы «Калядны фэст» у Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, які рыхтаваў аддзел народных мастацкіх рамёстваў
і фальклору) атрымала свой дастойны працяг і адбылася на задавальненне ўдзельнікам і арганізатарам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Добра адсвяткавыўшы Каляды, спадзяемся, што новы каляндарны год прынясе нам яшчэ падобныя дзіцячыя і маладзёжныя мастацкія аб'яднанні скіраваныя на развіццё творчых асобаў сродкамі традыцыйнай культуры.

Напрыканцы варта падкрэсліць наступнае: 1)этнакультурнае выхаванне з'яўляецца вельмі важным сродкам у працэсе эмацыйнага, пачуццёвага развіцця сучасных дзяцей і моладзі; 2)заняткі ў дасканалых фальклорных аб'яднаннях, функцыянуючых у «ідэйным і дыдактычным полі» заснавальнікаў фестывальнага праекта «Берагіня» (дзе сацыялізацыя і інкультурацыя злучаюцца з сінкрэтызмам традыцынай мастацкай культуры беларусаў) комплексна развіваюць творчыя здольнасці дзяцей і моладзі; 3)нават не бяручыя ўдзел непасрэдна ў «Берагіні» гурты, але знаёмыя з яе сістэмай (напрыклад, фальклорны калектыў Шчомысліцкай АСШ «Явар») з'яўляюцца здольнымі да ўдзелу ў аднаўленні каляндарных свят, здзяйсненні буйных творчых праектаў.

**Спіс літаратуры:**


1. Зварот сакратарыята ТБМ [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://naviny.by/rubrics/society/2010/10/30/ic_news_116_354553/. – Дата доступа : 26.01.2011.
2. Кукушин, В.С. Этнопедагогика и этнопсихология / В.С. Кукушин, Л.Д. Столяренко. – Ростов-на-Дону : Феникс, 2000. – 448 с.
3. Кухаронак, Т. Роля традыцыйнай культуры беларусаў у сучасным выхаваўчым працэсе / Т. Кухаронак // Народная спадчына Бацькаўшчыны / укл. М. Козенка. – Мінск : Чатыры Чвэрці, 2002. – С. 54-59.
4. Калацэй, В.В. Этнакультурнае выхаванне як неабходны складальнік сацыялізацыі навучэнцаў (на прыкладзе дзейнасці Мётчанскай СШ) / В.В. Калацэй // Традыцыйная культура і дзеці : праблемы захавання і пераемнасці : зб. матэр. навук.-практ. канф. – Мазыр : МазДПІ імя Н.К. Крупскай, 2001. – С. 70-74.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ